УДК 655.11

С. А. Буцько, магістрант;
М. С. Шмаков, доц., канд. техн. наук
(БГТУ, г. Мінск)

# ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ. РЭКАНСТРУКЦЫЯ ДРУКАРСКАГА ПРЭСА XVI СТАГОДДЗЯ

2017 год у Беларусі будзе адзначаны святкаваннем 500-годдзя кнігадрукавання на ўсходнеславянскіх землях. Гэтая дата з'яўляецца важнай для нашай краіны з пункту гледжання нацыянальнай самасвядомасці і развіцця беларускай духоўнай і культурнай спадчыны. Гэтак жа, як Віленскі Універсітэт з'яўляецца першай вышэйшай навучальнай установай на ўсходнеславянскіх землях, так Скарына першым прынёс друкаванае слова ў гэты рэгіён і ў чарговы раз зацвердзіў статус нашай дзяржавы як цэнтра развіцця культуры і навукі славян.

Асабліва цікава тэхнічная рэалізацыя распаўсюджвання друкаванага слова Францыскам Скарынай.

Тэма дадзенай дысертацыі «Распрацоўка канструктарска-тэхналагічнай дакументацыі на друкарскі прэс XVI стагоддзя». Аналіз гістарычных крыніц паказвае, што немагчыма на сённяшні дзень з поўнай упэўненасцю заяўляць, што праект, які распрацоўваецца цалкам супадае з арыгіналам, які выкарыстоўваў Францыск Скарына, аднак дазваляе з высокай доляй верагоднасці сцвярджаць яго ідэнтычнасць.

Важнымі задачамі з'яўляецца глыбокі аналіз гістарычных і літаратурных крыніц па тэме даследавання, аналіз друкаваных тэхналогій XVI стагод¬дзя, распрацоўка тэхнічнага праекта з улікам тэхналагічных і трываластных разлікаў і тэхналогій XVI стагоддзя.

Дадзеная работа будзе складацца з наступных этапаў:

1. Аналітычны агляд тэхналогій друку XVI стагоддзя.
2. Пошук тэхнічных рашэнняў для рэканструкцыі друкарскага прэсу XVI стагоддзя.
3. Распрацоўка тэхнічнага праекта для рэканструкцыі друкарскага прэсу XVI стагоддзя.
4. Распрацоўка канструктарска-тэхналагічнай дакументацыі для рэканструкцыі друкарскага прэсу XVI стагоддзя.

Па выніках даследавання будзе пастаўлена пытанне аб укараненні вынікаў работы і вырабе дзеючага прататыпа для далейшых даследаванняў сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.